Родная газета на роднай мове
ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

**5 снежня 2024 года**

# ДОБРАЯ РАСПРАЦОЎКА ПАВІННА НЕ ЛЯЖАЦЬ, А УКАРАНЯЦЦА Ў ПРАКТЫКУ І ПРАЦАВАЦЬ

**Рэктар Беларускага дзяржаўнага аграрнага тэхнічнага ўніверсітэта Мікалай РАМАНЮК:**

— Задача, якую паставіў кіраўнік дзяржавы перад беларускай навукай ва ўсіх яе формах, — у новую пяцігодку ўвайсці практыкаарыентаванай — вельмі патрэбная і своечасовая. Згадзіцеся, што ролю ў развіцці сучаснай навукі адыгрываюць сувязі і дыялог навуковай супольнасці з прадстаўнікамі сектара рэальнай эканомікі. Важныя тут падтрымка і стымуляцыя мерапрыемстваў, дзе даследчыкі могуць прадставіць акуальныя распрацоўкі, падзяліцца экспертызай з калегамі.

Я заўсёды выступаў за тое, каб навучанне і навука ішлі побач, працавалі ў цесным узаемадзеянні, а галоўнае, каб абедзве гэтыя найважнейшыя сферы былі практыкаарыентаванымі. Наш універсітэт ганарыцца тым, што мы даўно і цесна супрацоўнічаем з навукова-практычнымі цэнтрамі Нацыянальнай акадэміі навук, што адтуль, у тым ліку і пры ўдзеле студэнтаў БДАТУ, выходзіць нямала цікавых распрацовак.

У нашым універсітэце зацверджаны графік выязных заняткаў на вытворчасці, а таксама ёсць 38 філіялаў кафедраў на вядучых прадпрыемствах аграпрамысловага комплексу, у навукова-практычных цэнтрах НАН Беларусі. Добрая, а галоўнае – эфектыўная пляцоўка для сумяшчэння вучобы, навукі і практыкі.

У нас таксама ёсць Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў АПК – толькі ў мінулым навучальным годзе ён рэалізаваў 17 актуалізаваных і новых навучальных праграм павышэння кваліфікацыі з разглядам пытанняў лічбавізацыі. Па ўзгадненні з Мінсельгасхарчам распрацаваны і рэалізаваны тры праграмы павышэння кваліфікацыі, якія забяспечваюць максімальна хуткае ўкараненне інавацый у вытворчы працэс. Сёлета ва ўніверсітэце адкрыліся інавацыйныя навукова-адукацыйныя лабараторыі дыстанцыйнага кантролю і кіравання сельскагаспадарчай тэхнікай і абсталяваннем, робатамі і дронамі, беспілотнымі робатамі. Ёсць даручэнне і ад Мінсельгасхарча арганізоўваць для намеснікаў старшынь райвыканкамаў на базе нашага інстытута сумесныя з вучонымі круглыя сталы, дзе яны будуць знаёміцца з рознымі інавацыямі для АПК.

Добрая распрацоўка, на мой погляд, павінна не ляжаць, а ўкараняцца ў практыку і працаваць. Але для гэтага вельмі важна забяспечыць сістэму поўнага

цыкла, якая ўключала б у сябе ўвесь ланцужок: ад фундаментальнай ідэі да ўкаранення канкрэтнага выніку ў практыку. Пагадзіцеся, для любога даследчыка ведаць, што яго распрацоўкі будуць запатрабаваныя на практыцы, з'яўляецца магутным стымулам, каб шукаць, знаходзіць і ўкараняць новыя эфектыўныя для эканомікі распрацоўкі.

**Алена ВІНАГРАДАВА.**